■ Аты-баты

# Навабранцы ў беларускай арміі прынялі прысягу

**У легендарных Пячах пад Барысавам у мінулую суботу, як гаворыцца, яблыку не было дзе ўпасці. Шмат людзей прыехалі туды на ўласных аўто, а з чыгуначнага прыпынку ішлі сапраўдныя калоны. Плыні накіроўваліся ў 72-і гвардзейскі аб'яднаны вучэбны цэнтр падрыхтоўкі прапаршчыкаў і малодшых спецыялістаў. Менавіта там больш за 1700 навабранцаў, прызваных увесну, вымаўлялі ўрачыстыя клятвы на вернасць Радзіме.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

— Момант прыняцця прысягі заўжды быў вельмі адказны. І мы вельмі доўга рыхтаваліся да гэтага, — кажа **салдат Цімур БУРЫЕЎ**, які неўзабаве стане артылерыстам. Атрымліваю зараз і дадатковую спецыялізацыю — радыётэлеграфіста. Кажа, што яна яму вельмі падабаецца.

— Я моцна хвалявалася, аддаючы сына ў армію, — гаворыць **маці Цімура Святлана ШАТАНАВА.** — Перажываю. Але лічу, што гэта добрая школа для мужчыны. І ён мусіць стаць сапраўдным абаронцам.

**Андрэй Свірскі** трапіў у войска пасля таго, як скончыў БДУ. Там ён атрымаў спецыяльнасць інжынера па тэлекамунікацыях.

— Думаю, яна мне будзе дарэчы падчас навучальнага перыяду, які працягнецца некалькі месяцаў, — разважае Андрэй. — Да службы я быў гатовы як фізічна, так і маральна. Ведаў, што пасля таго, як атрымаю дыплом, мне прыйдзе і павестка. А так доўгі час займаўся тэхквандо.

**Маці і бацька Андрэя** прыехалі з Віцебска.

— За савецкім часам я служыў у чыгуначных войсках у Калінінградскай вобласці і ў Эстонскай ССР, — кажа **Уладзімір СВІРСКІ.** — Пасля ўніверсітэта быў прызваны афіцэрам на два гады. Андрэй жа будзе служыць год. У параўнанні з савецкім часам цяпер значна лягчэй.

**Міністр абароны Андрэй РАЎКОЎ** пасля цырымоніі прыняцця ваеннай прысягі зазначыў, што ў новага папаўнення ёсць выдатны патэнцыял.

— Трэба кваліфікавана рыхтаваць кадры, здольныя выканаць тыя задачы, якія перад ім стаяць. Гэтым мы і займаемся. А кадраў хапае. Хачу пажадаць навабранцам не баяцца цяжкасцяў службы, паважаць і падтрымліваць адзін аднаго.

У навабранцаў цяпер тэарэтычную вучобу будуць змяняць практыкаванні на тэхніцы, палявыя паходы, стрэльбы. І больш за тое — некаторыя з іх ужо ў верасні возьмуць удзел у сумесным вучэнні Узброеных Сіл Беларусі і Расіі «Захад-2017».

# Сувораўцы назаўжды

**На пляцы Мінскага сувораўскага ваеннага вучылішча ў суботу грымела ўрачыстая музыка. 55 выпускнікоў ваеннай навучальнай установы кружыліся разам з выпускніцамі Мінскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў у вальсе, а ў неба ўзляталі жмені манет. У кожнага юнака, які атрымаў у легендарным будынку атэстат і адмысловы знак, іх было па 61. Менавіта столькі выпускаў пакінула сцены вучылішча за яго гісторыю...**

— У вас сёння радасны дзень, — звярнуўся да выпускнікоў **міністр абароны Андрэй РАЎКОЎ.** — Другім этапам станаўлення ў вас будзе атрыманне спецыяльнасці. Але нягледзячы на тое, што існуюць розныя роды войскаў, аб'ядноўвае вас адно — вы выйшлі са сцен Мінскага сувораўскага вучылішча. А як вы сябе раскрыеце на далейшым жыццёвым шляху, мы паглядзім. І вельмі ўважліва.

— Гэта трапяткое і ўрачыстае свята, — кажа **начальнік Мінскага сувораўскага ваеннага вучылішча палкоўнік Аляксандр НАВУМЕНКА.** — Наш калектыў поўнасцю ўсведамляе адказнасць, якая на іх ускладзена па навучанні і выхаванні гадаванцаў. Мы ўпэўнены, што яны па ўсім сваім жыцці пранясуць тое, што закладзена ў іх тут. Сведчаннем гэтага з'яўляюцца вынікі, якіх нашы сувораўцы дасягнулі падчас навучання. 95% выпускнікоў скончылі нашу ўстанову з адзнакамі 7—10. Чацвёра з іх атрымалі залатыя медалі. Упэўнены, што выхаванне і навучанне, якое ў нас атрымліваюць сувораўцы, дазволіць ім надалей засвоіць праграму навучання ў ваенных навучальных установах і ў жыцці па-за межамі аўдыторый.

**Выпускнік вучылішча Ягор ЗАБРОДСКІ**, які нарадзіўся ў Салігорску, ужо вызначыўся, куды будзе паступаць. Юнак намерваецца падаць дакументы ў Ваенную акадэмію на авіяцыйны факультэт.

— Тое, што хачу асвоіць кірунак франтавой авіяцыі, я зразумеў яшчэ на другім курсе. Заўжды хацелася ў неба. А да вучобы ў сувораўскім мяне падштурхнуў айчым. Ён сам служыў у Ваенна-марскім флоце і закончыў службу ў Мінску. Тут на час праляцеў вельмі хутка. Памятаю, як мне на 1-м курсе ўручылі пагоны. А цяпер я нядаўна рабіў тое ж. Сумна крыху адсюль сыходзіць, усё-такі за пяць гадоў прывык да калектыву. І да афіцэраў, якія навучылі нас абараняць Радзіму.

Першае, з чым адразу сутыкаецца выхаванец сувораўскага вучылішча, — гэта жорсткі распарадак дня ў параўнанні з цывільным жыццём. І разлічваць трэба ўжо ў першую чаргу на сябе і таварышаў.

— Наш сын прыйшоў у сувораўскае вучылішча маленькім хлопчыкам з шырока расплюшчанымі вачыма, — кажа **маці Вера МАЦАВІЛА.** — За ўвесь час вучобы давялося прайсці шмат бар'ераў. Псіхалагічна цяжка было адпраўляць яго з дому. Але ўсё гэта мы пераадолелі. І сын стаў дарослым адказным хлопцам, які ўмее адказваць за свае ўчынкі, фізічна трэніраваны, які хоча вучыцца вайсковай справе.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
*schklennik@zviazda.by*

■ Надвор'е

# ПАЧАТАК ТЫДНЯ — З ПАРАСОНАМ

**Першая палова бягучага тыдня будзе дажджлівай і ветранай, надвор'е палепшыцца бліжэй да выхадных, паведамляюць у Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды. Прычына таму — актыўныя атмасферныя франты, што рухаюцца на тэрыторыю краіны з боку Балтыйскага мора.**

Сёння днём, у аўторак, на большай частцы краіны прагназуецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 метраў за секунду. Гэта будзе суправаджацца навальніцамі, а ноччу ў асобных раёнах па ўсходзе Беларусі пройдуць моцныя дажджы. Тэмпература ўначы складзе 9—15 градусаў, удзень — 15—21. У сталіцы будзе воблачна з праясненнямі, магчымая навальніца. У Мінску будзе панаваць заходні вецер з парывамі да 20 м/с., тэмпература ноччу складзе 11—13 градусаў, днём — 16—18.

У сераду дажджлівае і ветранае надвор'е захаваецца, на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах магчымы навальніцы з узмацненнем ветру парывамі да 15—20 м/с. Ноччу слупок тэрмометра будзе знаходзіцца на ўзроўні 9—14 градусаў, днём паветра прагрэецца да 12—19 цяпла, а па паўднёвым захадзе да 20—22. Далей з ростам атмасфернага ціску надвор'е палепшыцца, вецер сціхне, а дажджы на большай частцы тэрыторыі Беларусі скончацца.

У чацвер чакаецца надвор'е без ападкаў, толькі па ўсходзе краіны ў асобных раёнах могуць прайсці кароткачасовыя дажджы. Тэмпература ўначы складзе 5—10 градусаў, удзень — 14—20, на паўднёвым захадзе да 23.

Паводле папярэдніх прагнозаў, канец тыдня таксама будзе характарызавацца больш спакойным надвор'ем. У пятніцу пераважна без ападкаў, па захадзе краіны магчыма кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Тэмпература ўначы 5—12, удзень 18—25. У выхадныя Беларусь застанецца ў зоне высокага ціску, да нас прыйдуць малаактыўныя франты з Заходняй Еўропы. Так, у суботу дажджы прагназуюцца толькі на паўднёвым захадзе, начная тэмпература складзе 8—15 градусаў, дзённая — 17—24, а па паўднёвым усходзе — да 27.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

■ Занятасць

## ЛЕТАМ ЗНАЙСЦІ РАБОТУ ПРАСЦЕЙ

### Узровень зарэгістраванага беспрацоўя за май склаў 0,9 працэнта

**За месяц беспрацоўе знізілася на 0,1 працэнтнага пункта ў Брэсцкай вобласці (да 1,1 працэнта), Гомельскай (да 1), Гродзенскай (да 0,9), Мінскай (да 0,8) абласцях і ў сталіцы (да 0,4). На Віцебшчыне і Магілёўшчыне гэты паказчык застаўся нязменным — 1,1 і 1 працэнт адпаведна.**

Летам узровень зарэгістраванага беспрацоўя традыцыйна зніжаецца. Гэта звязана з ростам вакансій на часовых і сезонных работах, павелічэннем попыту на працоўную сілу ў цэлым.

Калі параўноўваць з леташняй сітуацыяй, то за год колькасць незанятых грамадзян на ўліку зменшылася амаль на 26 працэнтаў (цяпер на ўліку стаіць 37,5 тысячы чалавек). Каэфіцыент напружанасці на рынку знізіўся з 1,5 да 0,7 беспрацоўнага на вакансію, а магчымасць умоўнага ўладкавання на работу вырасла ўдвая — з 68,9 да 133,6 працэнта.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

■ Крымінал

## Драма на Слабодскім

Страшная трагедыя адбылася ў адным з дамоў прыватнага сектара па завулку Слабодскі ў Магілёве. Па інфармацыі **афіцыйнага прадстаўніка ўпраўлення Следчага камітэта па Магілёўскай вобласці Аксана САЛЯНЮК,** у доме былі знойдзены целы забітых 43-гадовага мужа і 32-гадовай жонкі з колата-рэзанымі раненнямі. З месца здарэння правааахоўнікамі канфіскавана і мяркуемая прылада забойства — нож. Па факце распачата крымінальная справа (частка 1 артыкула 139). Праводзіцца шэраг мерапрыемстваў, накіраваных на высвятленне абставін здарэння. У загінулых засталася 11-гадовая дачка, зараз з ёй працуюць псіхолагі. Па словах суседзяў, сужэнцы апошні час часта канфліктавалі, нават падавалі на развод. Муж працаваў у Маскве, а жонка ў адной з магілёўскіх арганізацый. Няшчасце, кажуць, здарылася ў хуткім часе пасля вяртання мужчыны дамоў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*


## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

по объекту «Реконструкция застройки территории в районе ул. Михалово, Алибегова.» Жилой дом №5 по генплану».

**Сведения о застройщике.**

Застройщик – коммунальное унитарное дочернее предприятие «Управление капитального строительства Запад», зарегистрированное Мингорисполкомом 05.01.2015 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №192400611.

Юридический адрес: 220025, г. Минск, ул. С. Есенина, д. 4-107, тел./факс 234-16-99, тел. 234-16-98. Режим работы: понедельник – четверг с 8.30 до 17.30, пятница с 8.30 до 16.15. Обеденный перерыв с 13.00 до 13.45.

Выполняя функции заказчика, в течение последних трех лет Застройщиком построены и введены в эксплуатацию объекты: жилые дома №4, 6 по ул. С. Есенина; жилой дом №14а по ул. Короля; жилые дома №12, 16, 22 по ул. Чюрлениса; жилые дома №3, 5, 7 по ул. Я. Брыля.

Цель проекта – строительство объекта «Реконструкция застройки территории в районе ул. Михалово, Алибегова.» Жилой дом №5 по генплану».

Начало строительства объекта – март 2017.

Предполагаемый срок ввода объекта в эксплуатацию – октябрь 2017.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу, получено положительное заключение ДРУП «Госстройэкспертиза по г. Минску» от 27.06.2016 №303-60/16.

Участки площадью 0,7984 га переданы к Коммунальному унитарному дочернему предприятию «Управление капитального строительства Запад» решением Мингорисполкома от 21.02.2017 №497 «Об изъятии, предоставлении земельных участков и разрешении строительства».

Свидетельство (удостоверение) о государственной регистрации земельного участка от 27.03.2017 №500/729-1718.

Разрешения Госстройнадзора на производство строительно-монтажных работ – №2-203Ж-004/17 от 15.03.2017, от 29.04.2017.

Генеральный подрядчик – ОАО «Минский домостроительный комбинат» (договор строительного подряда №2-2017 от 10.03.2017).

Жилой дом запроектирован 10-этажным, четырехсекционным в конструкциях серии ЗА-ОПБ крупноблочных жилых домов, с техническим подпольем, «теплым» техническим чердаком. Всего квартир – 169, в том числе: 1-комнатных – 39, 2-комнатных – 82, 3-комнатных – 48. Общая площадь квартир – 10313,31 кв. м. Высота этажа – 2,8 м (от пола до пола).

Отделка наружных стен – фактурное покрытие защитно-декоративным полимерным составом, окраска акриловой фасадной краской. Окна, балконные дверные блоки, остекление лоджий – ПВХ-профиль. Наружные входные двери – металлические. Предусмотрены лифты (по одному лифту в каждой секции) грузоподъемностью 1000 кг, мусоропровод, поквартирный учет холодной и горячей воды, электроэнергии и тепла. Квартиры оборудованы автономными пожарными извещателями. Кухни квартир оборудуются напольными электрическими плитами. Лоджии первого этажа запроектированы с погребами, используемыми в качестве хозяйственных кладовых.

Проектом предусмотрена внутренняя отделка жилых помещений типовых потребительских качеств.

В состав общего имущества объекта входят лестницы, лестничные клетки, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, кровля, технические и подвальные этажи, другие места общего пользования, ограждающие несущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование общедомового назначения, находящееся за пределами или внутри жилых помещений.

В коммунальную собственность г. Минска для переселения граждан из жилых домов, подлежащих сносу в связи с предоставлением земельных участков под жилищное строительство, безвозмездно передается 4,8% общей площади жилых помещений дома.

**Согласно решению Мингорисполкома от 04.05.2017 №1467 «О строительстве жилых домов для многодетных семей» строительство жилых помещений будет осуществлено для многодетных семей по направлениям администраций районов г. Минска с привлечением государственной поддержки в виде льготных кредитных ресурсов.**

**Для заключения договоров создания объектов долевого строительства предлагается 161 (сто шестьдесят одна) квартира, в том числе:**

- 37 (тридцать семь) 1-комнатных общей площадью от 42,33 до 42,88 кв. м;
- 79 (семьдесят девять) 2-комнатных общей площадью от 55,94 до 62,35 кв. м;
- 45 (сорок пять) 3-комнатных общей площадью от 77,05 до 83,64 кв. м.

Стоимость 1 кв. м общей площади объекта долевого строительства на день опубликования проектной декларации в текущих ценах с учетом прогнозных индексов для нормативной площади –**1 094,15 рублей**, для площади, превышающей нормативную – **1 435,67 рублей.**

**Условия оплаты –** ежемесячно на основании представленных застройщиком справок о стоимости выполненных работ, затратах застройщика и размере очередного взноса для оплаты стоимости строительства жилого помещения.

**Для заключения договоров необходимы:**

- паспорт и личное присутствие лица, с которым будет заключаться договор;
- направление администрации района г.Минска на долевое строительство;
- справка о состоянии на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий.

Документы для заключения договоров будут приниматься **с 19.06.2017 по адресу: г. Минск, ул. Сергея Есенина, д. 4, офис 107, каб. 1, тел.: (017) 234-16-98, (044) 795-44-44**